# Цёплы ўспамін… І словы ўдзячнасці

**«Не смейце забывать учителей!» – гэтыя словы з верша вядомага расійскага паэта Андрэя Дзяменцьева сёння ўспрымаюцца як наказ усім тым, хто, закончыўшы школу, узяў білет у самастойнае жыццё і ідзе сваім шляхам па яго велізарных прасторах.**

70-годдзе роднай гімназіі №7 падштурхнула на ўспамін аб школьных гадах і яшчэ раз нагадала аб тым, якую значную ролю адыгралі ў маім жыцці настаўнікі. Ім я і выказваю сваю ўдзячнасць.

Класны кіраўнік, настаўніца беларускай мовы і літаратуры Тацццяна Уладзіміраўна Буйко, дзякуючы якой школьнае жыццё заўсёды было яскравым і цікавым. Самы цёплы ўспамін пра аднаго з класных кіраўнікоў, выкладчыцу гісторыі і грамадазнаўства Валянціну Аляксееўну Сюркову, настаўніц рускай мовы і літаратуры Алену Віктараўну Бедункевіч і Вольгу Паўлаўну Клепакову.

Спачатку студэнтам, а затым магістрантам і выкладчыкам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў часта ўспамінаў настаўніка інфарматыкі Ірыну Міхайлаўну Шчыгельскую, з якой мы ажыццявілі некалькі крэатыўных праектаў. Назаўсёды запомню тую творчую атмасферу, якая панавала ў яе кабінеце ў час работы над гэтымі праектамі.

І, безумоўна, дырэктар гімназіі Вольга Васільеўна Малярэвіч – таленавіты кіраўнік, цудоўны выкладчык і проста шчыры чалавек, стваральнік сузор'я лепшых настаўнікаў і кваліфікаваных супрацоўнікаў гімназіі, якую заўсёды прыемна павіншаваць з Днём настаўніка, Новым годам, Днём жанчын…

Вялікае дзякуй усім педагогам гімназіі №7! Моцнага ім здароўя, асабістых поспехаў, прафесійных перамог і таленавітых вучняў!

**З павагай, Павел САПОЦЬКА, выпускнік 2009 года.**

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ